УДК 821. 161. 3 – 1“19”

*І.М. КУЛЬБЯНКОВА*

# ПАСЛАННЕ ЯК ЛІТАРАТУРНЫ ЖАНР У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX ст.: ВЫТОКІ І ЭВАЛЮЦЫЯ

*У артыкуле прасочваецца станаўленне і эвалюцыя жанра* ***паслання****, да гэтага часу як след не ацэненага літаратуразнаўствам. Аўтар даследавання доказна паказвае змястоўныя і фармальныя змены, што адбыліся ў пасланнях на працягу XX ст., засяроджвае ўвагу на праблеме дыфузіі родавых асаблівасцей у іх. Апошняе вызначае ў артыкуле наватарства канцэпцыі, пакладзенай у яго аснову, а таксама прынцып адбору фактычнага матэрыялу: тэарэтычныяназіранні пацвярджаюцца аналізам твораў Янкі Купалы, у вершах якога назіраецца большасць асноўных разнавіднасцей паслання; Максіма Танка, які пры дапамозе разглядаемага жанру пераадольваў звужанасць ідэйна-тэматычнага зместу лірыкі; Янкі Сіпакова, пасланні якога па высокай ступені абагульнення набліжаюцца да прытчы; Валянціны Коўтун з удалымі спробамі аднаўлення магчымасцей старажытнага жанру і іншых аўтараў.*

У сістэме лірычных жанраў (жанраў паэзіі) вылучаецца група сталых (традыцыйных), што выявілі сябе даўно, яшчэ ў часы старажытнасці, і захаваліся ў

мадыфікаваным (радзей чыстым) выглядзе і ў канцы XX – пачатку XXI ст. Да іх належаць ода, элегія, балада, пасланне. Што датычыцца санета, трыялета, рандо, рандэля, хоку, танкі, туюга і іншых твораў, то іх лепш за ўсё лічыць традыцыйнымі вершаванымі формамі, бо ў кожным з іх можа вар'іравацца, відазмяняцца жанравы змест, пафас (трагедыйны, гераічны, сатырычны, сентыментальны) пры нязменнасці менавіта формы. Тэарэтычная недапрацоўка ў дадзеным плане вядзе да таго, што вершаваныя формы некаторыя даследчыкі тлумачаць як жанры.

У беларускім літаратуразнаўстве даволі грунтоўна з жанраў паэзіі даследавана балада І.Ф. Штэйнерам [1], а яшчэ раней В. Бечыкам і М. Ярошам [2]. У меншай ступені пашанцавала элегіі [3]. І абсалютна мала напісана пра пасланне, яго спецыфіку, своеасаблівасць, месца, якое яно займае сярод іншых жанраў. Мэта нашага артыкула – кампенсаваць недахоп назіранняў у гэтым плане.

Пасланне – жанр, напісаны як зварот да той ці іншай асобы ці аб'екта, у форме ліста, часта ўяўляе сабой сяброўскае разважанне, утрымлівае рэкамендацыі на многія выпадкі жыцця. Яго спецыфіка вызначаецца ў першую чаргу формай, а змест можа быць розным – сцвярджальным і адмаўляльным, высокім і нізкім, гераічным і сатырычным, інтымна-даверлівым, глыбока асабістым і грамадзянска-страсным, абагульненым, як у "Слове да Аб'яднаных Нацый" А. Куляшова. Фармальна – усе пасланні аднолькавыя, змястоўна – адметныя, разнастайныя. Іх форма мае старажытнае паходжанне і этыкетнае прызначэнне, якое раскрываецца яшчэ ў адным тэрміне-назве вершаў гэтага тыпу – эпістала (ад лац. epistol – ліст). Арыентуючыся на даўнюю традыцыю, пасланне захавала ўсе прыёмы, што выкарыстоўваліся пры напісанні лістоў: і ў адпаведнасці з этыкетам ветлівы ўступ, і абгрунтаванне прычын звароту да адрасата, і выклік яго на размову, на суперажыванне таго, што баліць аўтару, і напружанасць інтанацыі. Яркім узорам падобнага твора-закліка з'яўляецца твор-пракламацыя Я. Купалы "Беларускім партызанам". Звычайна ў пасланні выяўляецца сама асоба аўтара, які шукае ў адрасата спачування і саўдзелу ў асабістым лёсе, асабліва калі ён складваецца няўдала. Аднак у другой палове XX ст. многія асаблівасці, уласцівыя ранейшаму пасланню, у тым ліку адзначаныя вышэй, часта не захоўваюцца, ігнаруюцца. Так, напрыклад, пасланні Я. Сіпакова з кнігі "У поўдзень, да вады", "Да біяграфіі майго народа. І.", "Да біяграфіі майго народа. ІІ" і многія іншыя ўтрымліваюць зваротак да народа толькі ў пачатку твора, а ўсё астатняе ўяўляе сабой усхваляванае аўтарскае разважанне-перажыванне лёсу краіны, агульную філасофскую ацэнку шляху, пройдзенага ёю на працягу стагоддзяў.

Пасланне ведала яшчэ антычная літаратура: Гарацыем быў створаны такі цудоўны твор, як "Пасланне да Пізонаў", напісаў выдатныя творы Авідзій. Менавіта ў часы старажытнасці склалася і форма гэтага жанру, і яго асноўны змест – далёкі ад камернасці, ад звужанасці, ад абмежаванасці колам асабістых пачуццяў, падачай фактаў бытавога, сямейнага жыцця. Вытокі жанру паслання прасочваюцца і ў пазнейшай літаратуры, у прамовах, лістах, пасланнях да пэўных асоб ці народа ў цэлым, у так званай эпістальярнай творчасці. Выдатнымі ўзорамі эпістальярнага жанру можна лічыць "Прамову Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча", напісаныя ў форме звароту да чытача, дыялогавыя ў аснове. Старабеларуская літаратура ўвогуле настройвалася на актыўнае чытацкае ўспрыманне, пастаянна мела на ўвазе канкрэтнага адрасата, насіла ясна выражаны дыдактычны характар.

У XIX ст. беларускія паэты часта звярталіся і да сацыяльна-палітычнай ("Уставайма, братцы" В. Каратынскага, "Пісьмо з-пад шыбеніцы" К. Каліноўскага, "Не цурайся" Ф. Багушэвіча), і да літаратурнай ("Усёй трупе дабрадзея Старыцкага беларускае слова" Я. Лучыны, "Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею"

А. Гурыновіча, “Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу” А. Ельскага) разнавіднасцей старажытнага жанру. У пачатку XX ст. пасланне яшчэ больш актывізуецца, тэматычна пашыраецца, скіроўваецца на выхаванне ў народа нацыянальнай свядомасці, непрыняцця трагедыйных абставін. Яшчэ больш у гэты час павялічваецца яго дыдактычны патэнцыял, з'яўляюцца новыя жанравыя разнавіднасці. Сказанае лёгка пацвердзіць прыкладамі з творчасці Янкі Купалы, які ў нашаніўскі перыяд і ў 1918 – 1920 гг. выконваў місію прарока і адкрываў вочы свайму народу на бяспраўнае становішча.

Янка Купала стварае большасць асноўных разнавіднасцей жанру паслання. У яго сустракаюцца і сацыяльна-палітычнае пасланне (“Ворагам беларушчыны”), і пасланне, у якім на першай пазіцыі аказваецца аптымістычная вера ў будучыню, жыццесцвярджальнае, грамадзянскае, адычнае па настрою (“Арлянятам”), і творы на літаратурную тэму, у аснове якіх спрэчкі, дыскусіі, эстэтычныя ацэнкі, палеміка пра задачы, мэты і прызначэнне мастацкай творчасці, і даверлівая размова з субяседнікам (“Прывет вам”, “Аўтарцы «Скрыпкі беларускай»”). У асобных пасланнях пераважае сатырычны пафас. Яны наскрозь прасякнутыя пафасам адмаўлення прыстасаванства, здрадніцтва (“Дэпутату N”, “Слугам алтарным”). Некаторыя Купалавы пасланні інтымныя, даверлівыя па інтанацыі, у іх пераважае пачуццё замілаванасці, якое аўтар перажывае ад сустрэчы з прыгажосцю, гармоніяй, – гэта пасланні “Да дзяўчынкі”, “Да сваіх думак” і інш. Так беларускі паэт пашыраў магчымасці старажытнага жанру, надаваў яму рысы змястоўнай маштабнасці і стылявой разнастайнасці.

Прайшоўшы розныя стадыі развіцця, пасланне паступова суб’ектывізавалася і ў другой палове XX ст. набыло такія рысы, як павышаная экспрэсіўнасць, напружанасць інтанацыі і высокая ступень самавыяўлення мастака.

Для паэтаў пасланне – своеасаблівы Рубікон, які не кожны можа пераступіць паводле многіх фактараў. І першы з гэтых фактараў, магчыма, заключаецца ў тым, што ўзаемаадносіны мастакоў пры жыцці паміж сабой і з блізкімі, суб’ектыўныя адносіны аўтараў твораў да рэчаіснасці з’яўляюцца прафесійнай тайнай, сферай самага інтымнага і даверлівага. Другі, не менш важны фактар, заключаецца ў тым, што пасланне вымушае аўтара быць адкрытым, рытарычным, а ён стараецца ўнікаць просталінейных вывадаў і сентэнцый. Трэці фактар абумоўлены дыялогавым характарам названага жанру, што ўскладняе задачу мастака, ставіць перад ім шэраг “тэхнічных” праблем, прымушае валодаць драматургічным майстэрствам.

Пасланне – рэдкая з'ява ў творчасці тых аўтараў, якія схільныя да маналагічнай спавядальнасці, медытатыўнасці і не валодаюць прыёмамі эпічнага пісьма – стварэння вобразаў герояў-двайнікоў, ролевых герояў, адасобленых ад паэта, аб’ектыўных карцін і эпізодаў жыцця, перадачы яго падрабязнасцей. Да ліку падобных мастакоў адносіцца, напрыклад, Аляксей Пысін. Аналізуючы яго зборнікі, можна пераканацца, што ўсе вершы паэта – складнікі споведзі душы аўтара, часткі яго суцэльнага маналога пра нялёгкі чалавечы лёс, раны, нанесеныя вайной. Спавядальнасць, філасафічнасць прыводзяць да пераважнага карыстання паэта жанрам элегіі – вершаў рэфлектыўных, разважальных, спавядальных. Пасланне ж, якое ўвабрала ў сябе адзнакі эпасу і драматургіі, у Пысіна амаль поўнасцю адсутнічае. А тыя адзінкавыя творы, якія сустракаюцца – “Дзявочы халадок бярозы...” (адрасаваны Л. Сурначовай), “Добры конік «Запарожац...»” (прысвечаны Міхаілу Шумаву), “Падымаецца камочак песні” (адрасат Аляксей Зарыцкі), – уяўляюць сабой прачулыя сардэчныя споведзі пра сябе і блізкіх людзей. Пасланне часцей сустракаецца ў творчасці паэтаў, стыль якіх можна назваць сінтэтычным, адзначаным спалучэннем прыкмет лірычнага, эпічнага і драматургічнага пісьма. Шырока і часта карыстаюцца пасланнямі класікі нашай літаратуры

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Максім Танк, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч. Іх пасланні могуць быць і філасофскімі медытацыямі з ясна выражаным адрасатам (як пераважна ў М. Танка), і адкрытымі публіцыстычнымі зваротамі да людзей, да стагоддзя, да планеты ў цэлым, Радзімы (абсалютная большасць такіх – у П. Панчанкі), набліжацца па сваім пафасе і змястоўнасці да оды (творы П. Броўкі), элегіі (творы А. Куляшова), мець іранічны ці сатырычны характар (тыя ж творы Максіма Танка і Пімена Панчанкі). Пасланне ў творчасці нашых старэйшых пісьменнікаў мае невыпадковы характар, а ў кантэксце з іншымі жанрамі працуе на стварэнне маштабнай канцэпцыі свету і чалавека.

Часцей, чым іншыя мастакі, жанрамі паслання карыстаецца Максім Танк. Адносна А. Куляшова можна сказаць, што пасланне было для яго неабходным тады, калі яго творчасць насіла дыялогавы характар, была выразна публіцыстычнай, шматгалосай, "адкрытай". Дастаткова прыгадаць у сувязі з гэтым напісанае ім у першы пасляваенны год "Слова да Аб'яднаных Нацый" – ярка выражанае публіцыстычнае пасланне, прызначэнне якога – выказаць адносіны да таго, што робіцца ў суровы пасляваенны час – час канфрантацыі былых саюзнікаў па барацьбе з фашызмам. Пазней творчасць А. Куляшова набывае маналагічны характар ("Новая кніга"), і ў ёй застаюцца толькі рудыменты паслання ў асобных творах (зборнікі "Сасна і бяроза", "Хуткасць") – зваротах да людзей з заклікам берагчы і шанаваць спадчыну, зямны неруш.

У 60 – 80-я гг. XX ст. незвычайную шырыню ахопу з'яў рэчаіснасці дэманстраваў сваёй паэзіяй Максім Танк. Пра гэта сведчаць зборнікі яго вершаў "Прайсці праз вернасць", "За маім сталом", "Збор калосся". Прага эпізацыі, уменне паэта ствараць паўнакроўныя карціны рэчаіснасці, упісваць іх у агульную "мадэль свету" і на гэтай аснове раскрываць разнастайныя характары, высокая пафаснасць, выразнасць грамадзянскага тэмпераменту, імкненне ісці ад канкрэтнага да агульнага прадвызначылі зварот паэта і да жанру паслання.

Многія творы Максіма Танка са зборніка "Збор калосся" – "О, не пакідай мяне, смех...", "Табе", "Я твой", "Вось ужо...", "Садзіце лясы!" – пасланні, адрасаваныя сябрам, знаёмым, каханым, прыродзе, зямлі. Напісаныя на высокай ноце, натхнёна, узнёсла, яны ў той жа час роздумныя, маюць рысы, блізкія да оды і элегіі. Аўтар пры дапамозе гэтых твораў пераадольвае звужанасць ідэйна-тэматычнага зместу лірыкі.

Структура творчасці Максіма Танка – цікавая з'ява: абсалютная большасць яго спадчыны – творы-звароты да ўсяго існага, а затым ужо – творы-разважанні, якія "вырастаюць" на зваротах, падмацоўваюцца грунтоўнай прадметнай асновай, што закладзена ў іх "папярэдніках". Амаль у кожным творы М. Танка са зборніка "Збор калосся" ўтрымліваецца дыялогавы пачатак, які выліваецца ў спрэчку, дыскусію з сабой і іншымі, а тая ў сваю чаргу афармляецца праз зварот. У некаторых вершах зварот з'яўляецца ў пачатку, у многіх іншых – у сярэдзіне ці нават у канцы твора. Так, напрыклад, у вершы "Сведка" аўтар палемізуе з апалагетамі старога свету, якія даказваюць, што ён не мог засведчыць ранейшыя злачынствы, бо невядома, як вырваўся з іх кіпцюроў. У другой, заключнай частцы, паэт паварочвае ўсё дзеянне і разважанне на гэты свет, які прынёс яму столькі бедаў, і твор становіцца своеасаблівым зваротам да гэтага свету, пасланнем-прытчай, пасланнем-дакументам жывога сведкі жудасных падзей.

Паэзія Максіма Танка ў цэлым – нібы суцэльнае пасланне нам, землякам, пасланне шчырага і сумленнага чалавека, якому так хочацца выказацца пра набалелае нашчадкам, захаваць гармонію і шчасце на зямлі.

Пасланне-ліст пэўнаму адрасату можа напаўняцца розным зместам: філасофскай развагай пра жыццё і смерць, заклікам да барацьбы са змярцвеласцю

душы і цела, прызнаннем у любві да роднага краю, шчымлівай тугой у сувязі з расстаннем з каханай. Гэты твор – кангламерат розных тэмаў і ідэй, больш шырокі і поліфанічны, чым элегія, балада, эпіграма, эпітафія, ода і іншыя традыцыйныя жанры лірыкі і ліра-эпасу. Змястоўная свабода адкрывае магчымасці гэтага жанру тым пісьменнікам, якія любяць сюжэтную, маштабную творчасць, прозу і драматургію, могуць глядзець на свет і сваімі вачыма, і вачыма апанентаў.

Л. Дайнека даўно стаў вядомым празаікам, майстрам твораў на гістарычную тэматыку, да якой прыйшоў праз паэтызацыю сцэнак, эпізодаў, здарэнняў, выпадкаў, апісаных падрабязна, але лаканічна і сцісла. Ужо ранняя лірыка аўтара характарызавалася выразным эпізмам, а лірычны герой выступаў у некалькіх іпастасях. На падобнай аснове і ўгрунтоўваецца паэтава пасланне, што поўніцца імкненнем праз знешнія дэталі раскрыць унутраны свет героя. “Дождж” (прысвячэнне М. Дуксу), “Беларусі”, “Радзіме”, “Вячэрні самалёт” (адрасат Хв. Чэрня), “Маці”, “Касцёр у Каралішчавічах” (творы звернуты да М. Аўрамчыка) – усе творы-пасланні мастака слова цяжка пералічыць. Яны ўвайшлі ў мастацкую сістэму паэзіі Л. Дайнекі неад’емным складнікам.

Пасланне Л. Дайнекі, у адрозненне ад паслання Максіма Танка, не мае “двайнога дна”, амаль не грунтуецца на асацыятыўнай вобразнасці, сэнсавай падтэкставасці, не носіць прытчападобнага характару, а з’яўляецца ліра-эпічным, прадметна-выяўленчым, бярэ за аснову трапную мастацкую дэталь, яскравы троп.

Іншы тып паслання – на аснове ацэнкі лёсу народа ў цэлым – стварае Я. Сіпакоў. Яго творы – “Да біяграфіі майго народа.І”, “Да біяграфіі майго народа.ІІ”, “Вайна”, “Уяўляеце, зямляне...” і іншыя вяртаюць нас да традыцый класіцысцкай пары, калі пасланні мелі адычны характар, арыентаваліся на раскрыццё агульнадзяржаўных інтарэсаў, а паэты імкнуліся выказаць ідэі справядлівасці, гуманнай дзяржаўнасці, патрыятызму. Пасланні Сіпакова адрасуюцца зямлянам, усяму насельніцтву планеты. У іх на першым плане агульнанародныя інтарэсы, спрадвечная народная філасофія. Пасланні гэтага паэта прасякнуты невымернай трывогай. Напісаныя ў застойныя гады, яны клікалі народ адчуць нялёгкасць свайго становішча. Гэтыя творы па высокай ступені абагульнення, па адкрытасці павучальнага зместу, жыццёвай мудрасці іх аўтара набліжаюцца да прытчы.

Удалыя спробы аднаўлення магчымасцей старажытнага жанру знаходзім у кнізе паэзіі В. Коўтун “Метраном” (1985). Многія з твораў, змешчаных у ёй, маюць канкрэтнага адрасата – дрывасека, тапор якога “бяжыць, як факстэр’ер”, і рассякае напалам птушыныя гнёзды (“Мілы наш сучасны дрывасек...”), прагрэс (“Да прагрэсу”), паэтаў-равеснікаў (“Майстры, майстры...”), славутага майстра слова (“Максіму Танку”). Па змесце – гэта роздумы над вечнымі пытаннямі дабра і зла, радасці і бяды, рэгрэсу і прагрэсу. Яны трымаюцца на мастацкай дэталі, асацыятыўнай вобразнасці.

Такім чынам, аналіз фактычнага матэрыялу дазваляе зрабіць наступныя вывады.

1. Старажытны жанр паслання прайшоў складаную эвалюцыю ад эпістАлярнага жанру з канкрэтным (часцей бытавога характару) зместам, у строгай форме ліста да твора шматпафаснага, шматпраблемнага, свабоднага і разнастайнага ў фармальных адносінах.

2. Пасланнем як жанрам часцей за ўсё карыстаюцца мастакі слова, якія ўмеюць паяднаць у сваёй творчасці рысы трох класічных родаў літаратуры – лірыкі, эпасу і драмы, такія, як Максім Танк, Янка Сіпакоў, Валянціна Коўтун і інш.

3. У другой палове ХХ ст. пасланне было вядучым паэтычным жанрам беларускай літаратуры нароўні з одай, элегіяй, баладай.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Штэйнер, І.Ф.*** Варожаць балады вякоў: Беларуская балада і славянскія традыцыі / І.Ф. Штэйнер. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 240 с.
2. ***Бечык, В.Г.*** Беларуская савецкая лірыка / В.Г. Бечык, М.Г. Ярош. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 304 с.
3. ***Мішчанчук, М.І.*** Ёсць у паэта свой аблог цалінны...: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі / М.І. Мішчанчук. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 189 с.

Паступіў у рэдакцыю 17.05.2006 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова